# ВОДЗЫЎ

на аўтарэферат дысертацыі Ненадаўца Ягора Аляксеевіча «Водная прастора ў беларускім фальклоры: семантыка, сімволіка, функцыянальнасць», прадстаўленай на суісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.09 – фалькларыстыка

Фальклорна-міфалагічная спадчына беларускага народа захавала светапоглядныя, культурныя, ментальныя стэрэатыпы традыцыйный культуры. Адной з таямнічых субстанцый, якую чалавек да канца так і не змог разгадаць, з'яўляецца вада (водная прастора). У апошнія дзесяцігоддзі ўвагу даследчыкаў прыцягваў гэты адзін з самых старажытных і ўніверсальных архетыпаў. Дысертацыйная праца Ягора Аляксеевіча Ненадаўца прысвечана грунтоўнаму вывучэнню воднай прасторы, праведзена яе комплекснае даследаванне на матэрыяле беларускай вуснапаэтычнай творчасці.

У дысертацыі прааналізаваны аб'ёмны корпус фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў, як апублікаваных, так і сабраных асабіста аўтарам падчас палявых экспедыцый, што ўзмацняе доказную базу даследавання. Упершыню ўводзіцца ў навуковы ўжытак вялікі пласт фальклорных і этнаграфічных матэрыялаў. Неабходна падкрэсліць высокую выніковаць у вырашэнні пастаўленых задач.

Даследаванне, несумненна, актуальнае, вызначаецца навізной у тлумачэнні атрыбутыкі і прэдыкатыўнасці водных сімвалаў, іх ролі пры ўтварэнні светабудовы. Упершыню у айчыннай фалькларыстыцы водная прастора становіцца асобным аб'ектам вывучэння і даследуецца комплексна: у каляндарнай і сямейна-бытавой абраднасці, у чарадзейных казках, беларускіх замовах, малых жанрах беларускага фальклору. Асобны раздзел прысвечаны аналізу так званай “зямной вады” (дождж, крыніцы, рэкі, азёры, балоты).

Варта адзначыць значную публікацыйную актыўнасць дысертанта (26 пазіцый, сярод якіх 2 у калектыўных манаграфіях, 10 – у рэцэнзуемых навуковых выданнях Рэспублікі Беларусь), удзел у канферэнцыях, у тым ліку і міжнародных.

Структура, змест і афармленне аўтарэферата дысертацыі «Водная прастора ў беларускім фальклоры: семантыка, сімволіка, функцыянальнасць» сведчаць пра тое, што прадстаўленая да абароны работа выканана на высокім навукова-метадычным узроўні, а яе аўтар Ненадавец Ягор Аляксеевіч заслугоўвае прысуджэння навуковай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.09 – фалькларыстыка.

Кандыдат філалагічных навук,
дацэнт, дацэнт кафедры
беларускай мовы
УА «Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Ф. Скарыны» С.А. Вяргеенка

АДДЗЕЛ КАДРАЎ
Подпіс
ЗАВЯРАЮ